1. Арлова, Г.П. Беларуская народная педагогіка / Г.П. Арлова. – Мн.: Народная асвета, 1993. – 120 с.

2. Беларусы. Т.4: Вытокі і этнічнае развіццё / В.К. Бандарчык, В.М. Бялявіна, Г.І. Каспяровіч і інш.; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мн.: Бел.навука, 2001. – 433 с.

3. Беларускія народныя абрады / склад. Л.П. Касцюкавец. – Мн.: Беларусь, 1994. – 128 с.

4. Беларускія народныя казкі/ АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору [склад. Г.А. Барташэвіч, К.П. Кабашнікаў]. – 2-е выд., дап. – Мн.: Навука і тэхніка, 1985. – 512 с.

5. Беларускія народныя песні. Са зборнікаў П. Шэйна / склаў К. Кабашнікаў. – Мн.: Дзяржвыд БССР, 1962. – 432 с.

6. Беларускія прыказкі, прымаўкі і загадкі / склаў Я. Рапановіч. – Мн., 1958. – 380 с.

7. Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы / склаў Ф. Янкоўскі. – 3-е выд. – Мн.: Навука і тэхніка, 1992. – 491 с.

8. Беларускія частушкі / склад. К.П. Кабашнікаў, І.К. Цішчанка. – Мн., 1960. – 184 с.

9. Беларусы. Т. 5: Сям’я / В.К. Бандарчык, Г.М. Курыловіч, Т.І. Кухаронак і інш.; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мн.: Бел. навука, 2001. – 375 с.

10. Болбас, В.С. Этычная педагогіка беларусаў / В.С. Болбас. – Мн.: Бел. навука, 2004. – 175 с.

11. Гульні, забавы, ігрышчы / склад. А.Ю. Лозка. 2-е выд. – Мн.: Беларуская навука, 1996. – 534 с.

12. Жарты, анекдоты, гумарэскі / склад. А.С. Фядосік. – Мн.: Навука і тэхніка, 1984. – 438 с.

13. Земляробчы каляндар: Абрады і звычаі / уклад. А.І. Гурскі. – Мн.: Беларуская навука, 1995. – 186 с.

14. Змановский, Ю.Ф. К здоровью без лекарств / Ю.Ф. Змановский. – М.: Сов. спорт, 1990. – 64 с.

15. Кухаронак, Т.І. Радзінныя звычаі і абрады беларусаў: Канец XIX – XX ст. / Т.І. Кухаронак. – Мн.: Навука і тэхніка, 1993. – 126 с.

16. Міфы Бацькаўшчыны / Беларус. Энцыкл.; уклад. У.А. Васілевіч. – Мн.: БелЭн, 1994. – 109 с.

17. Народная педагогіка. Вучэбна-метадычны дапаможнік / Г.П. Арлова, Т.Д. Вакушэнка, А.Л. Міхайлава, С.Р. Туболец; пад рэд. Г.П. Арловай. – Віцебск: Выд-ва УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”, 2006. – 168 с.

18. Народная педагогіка беларусаў / У.М. Конан, В.С. Болбас, П.Г. Ляўта і інш. – Мн.: Нац. ін-т адукацыі, 1996. – 165 с.

19. Орлова, А.П. Этнопедагогика: теория нравственного воспитания: учеб. пособие / А.П. Орлова. – Витебск: ВГУ им. П.М. Машерова, 2001. – 186 с.

20. Ракава, Л.В. Традыцыі сямейнага выхавання ў беларускай вёсцы / Л.В. Ракава. – Мн.: Ураджай, 2000. – 111 с.

21. Сержпутоўскі, А.К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / прадм. У.К. Касько / А.К. Сержпутоўскі. – Мн.: Універсітэцкае, 1998. – 301 с.

22. Чумаков, Б.Н. Валеология: Избранные лекции / Б.Н. Чумаков. – М.: Российское педагогическое агентство, 1997. – 245 с.

23. Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя / гал. рэд. І.П. Шамякін. – Мн.: БелСЭ, 1989. – 575 с.

# СЦЭНАРЫІ БЕЛАРУСКІХ НАРОДНЫХ СВЯТ І ГУЛЬНЯЎ

## СЦЭНАРЫЙ
## СВЯТА Ў ГОНАР ПРЫРОДЫ І ВЯСНЫ-КРАСНЫ

*Гучыць музыка. Выходзіць першы блок вядучых.*

**I.**

- Родная зямля, любая Беларусь! Вось яна – зямля святая дзядоў і прадзедаў.
- Яна – перад табой, яна з табой. Гэта і тая вішанька, што здзівіла цябе хараством першага цвіцення.
- І рэчка, што пяшчотна лашчыць цябе сваімі хвалямі, вабіць няспынным зіхаценнем і імкненнем.
- І лес, што сустракае цябе дружалюбным гоманам, дорыць табе першую пралеску і першы грыбок.
- І бяздоннае загадкавае неба над табой, і тая сцяжынка, па якой ты ідзеш у садок, ці ў школу.
- Як не любіць усё гэта – тваё блізкае, роднае? Хочацца працаваць, рабіць нешта добрае дзеля Беларусі, бацькаўшчыны нашай, Радзімы.

**II.**

*(Гучыць музыка. Выходзіць другі блок вядучых)*

- У старажытнасці чалавек быў намнога бліжэй да прыроды, чым цяпер. Танчэй адчуваў яе, назіраў за ёю, супастаўляў, параўноўваў яе з сабою.
- Калі раней нашы продкі будавалі дом, то абавязкова стараліся пасадіць каля яго дрэва.
- Як вы думаеце, дзеля чаго?
- Адказ просты. Каб у сябе дома стварыць зямны рай, накшталт райскага саду – Эдэма, дзе сярод мноства прыгожых дрэў і раслін расло дрэва пазнання Дабра і Зла, з якога Адам і Ева пакаштавалі забаронены яблык.
- Для людзей дрэвы былі блізкімі і дарагімі. Іх нельга было выкарыстоўваць у будаўніцтве. Драўніну прывозілі з лесу. Такі звычай існуе і сёння.
- Дрэвы разам з мясцовасцю ствараюць пейзажы. Тое, да чаго прывязваецца душа чалавека.
- Людзі імкнуцца стварыць вакол сябе прыгажосць, і калі скажаецца, разбураецца прырода, то разбураецца і душа чалавека. Не толькі таго, хто зрабіў гэта злачынства, але і таго, хто толькі бачыў і не перашкодзіў.
- У нашых продкаў існаваў культ прыроды, птушак, жывёл, раслін, што найбольш яскрава адлюстравалася ў вясновых святах і абрадах.
- А зараз мы запрашаем вас на прызбу да Яся і яго сяброў.
- На свята ў гонар прыроды і Вясны-Красны.
- Паглядзіце, з якой павагай раней адносіліся да ўсяго жывога.
- Да нашай Маці-Прыроды.

*(гучыць ціха, а потым гучней песня Жаваранка)*

*На двары з'яўляецца Ясь. Яму весела, таму што прыгравае сонца і на дварэ добра гуляць. Чуе: нешта звоніць у небе тоненькім срэбным званочкам. Ясь прыслухаўся.*

**Ясь:** Дык гэта ж жаваранак! Мілая птушачка! Яна ўжо вярнулася з далёкага краю. Сябры, сябры! Жаваранак прыляцеў! Выходзьце хутчэй на двор слухаць першую песню Вясны!

*Выходзяць хлопчыкі і дзяўчынкі, сябры Яся з песняй “Жавароначкі”.*

- Вясну песенькай сустракаем,
  Вясну весела мы гукаем.
- Ходзім радасна карагодам;
  Выглянь сонейка, дай пагоду!
- Шчасце, долечку мы гукаем
  І зямлю сваю адмыкаем.
- Жыта-жыцейка хай рунуе,
  Кветкі-красачкі хай квітнеюць.
- Свята шчырае мы сустракаем,
  Птушак з выраю мы вітаем!

(*падкідваюць угору птушак, зробленых з паперы)*

- Птушак будзем шанаваць,
  Ім ва ўсім дапамагаць!
- Гнёзды іх не разбураць,
  Птушанят абараняць
  І ўсіх птушак услаўляць.

**Ясь:** Хлопцы, дзяўчаты! А ці ведаеце вы, якія птушкі прылятаюць услед за жаваранкамі?

(*дзеці па чарзе: “Шпак! Ластаўка! Качкі! Бусел! А за буслом і ўсе птушкі ўжо прыляцяць”*)

- А я пакуль бег да вас, на полі гракоў бачыў. А мая бабуля кажа: як грака ўбачыш на полі – выходзь вясну сустракаць.
- Ой, сябры мае! Мне ўчора дзядуля Тамаш загадваў новыя загадкі пра птушак. Паспрабуйце і вы адгадаць:

Снег яшчэ ляжыць, а ён ужо тут як тут. (*Грак*)

1. А маю загадку адгадаеце?
   З выраю вяртаецца, з песняй да свету звяртаецца. *(Жаваранак)*
2. А цяпер маю загадку паслухайце.
   З пераду – шыльцы, ззаду – вільцы,
   Наверсе – чорнае сукно, пад іспадам – белае палатно. (*Ластаўка)*
3. А маю загадку адгадаеце?
   Даўганосы, даўганогі прыляцеў з далёкай дарогі. *(Бусел)*
4. А маю загадку, напэўна, ніхто не адгадае.
   У церамку жыве, прыгожы голас мае.
   Спявацъ вялікі ён мастак.
   Сябры, хто гэта? (*Шпак)*
5. Праз горы, даліны з далёкай краіны
   Вярнуўся пасол і стаў на страсе
   У ботах чырвоных,
   Каб бачылі ўсе. (*Бусел).*

*(Кампазіцыя “Іграў я на дудцы”)*

**Ясь:** Сябры, а ці ведаеце вы, адкуль бусел з’явіўся на Беларусі? І чаму іх так шануюць?

**Дзеці:** Не, не, не ведаем! Раскажы!

**Андрэй:** А я ведаю.

**Дзеці:** Ну, тады раскажы, Андрэй.

**Андрэй:** Ну дык слухайце легенду пра паходжанне бусла. Гэта было вельмі даўно. На зямлі развялося такое мноства гадаў, што ні стала ад іх жыцця ні людзям, ні жывёлам. І парашыў адзін чараўнік знішчыць гадаў, патапіць у якойсьці бяздонніцы. Сабраў ён іх у вялізны скураны мяшок, завязаў, узваліў на плячо аднаму чалавеку і загадаў укінуць

у паказанае прадонне. І строга наказаў, штоб не здарылась, не развязваць мех і не заглядваць туды. Але як толькі чалавек рушыў з месца, то ўсе гады, якія былі ў мяшку, заварушыліся, зашыпелі, засвісталі. І ўзяла чалавека цікаўнасць, што ён такое нясе. Чалавек развязаў торбу ды і аслупянеў ад жаху. Гады ж тым часам вылезлі і распаўзліся ізноў па зямлі. Разгневаны чараўнік не захацеў другі раз збіраць гэтую дрэнь і, накінуўшы на чалавека парожні мяшок, ператварыў яго ў бусла і загадаў збіраць гадаў-уцекачоў усё яго жыццё аж да самай смерці. І ходзіць гэты, ператвораны ў бусла, чалавек з накінутым на плечы мяшком па лугах, палях, балотах ды збірае гадаў, але да гэтай пары ніяк сабраць не можа. З прычыны сваёй крэўнасці да чалавека гэты пярэварэцень не адыходзіць далёка ад людскіх сяліб і мала баіцца людзей.

- Дзякуй, Андрэй, цікавая легенда.
- А мая маці на Дабравешчанне – свята прылёту буслоў сказала, што напячэ для нас цэлы кошык піражкоў, якія трэба будзе падкідваць угору са словамі: "Бусля, Бусля, на табе піражок, а мне дай жыта стажок". А той, чый піражок узляціць вышэй, у таго будзе ў гэтым годзе лепшы ўраджай жыта.
- Вось мы тут з вамі усе стаім, размаўляем, а трэба ўжо Вясну-Красну загукаць, ды песенькі ў яе гонар заспяваці, каб прырода хутчэй абудзілася ад зімовага сну.

*(дзеці пачынаюць перагукванне)*

- Вясна наша вясёлая – гу!
  Развесяліла зямлю, ваду – гу!
- Ой, вясна, вясна вясёлая!
  Парасла трава зялёная – у-у-у!
- Ды ўзвесяліла ўсе даліначкі,
  Дзе парабачкі, там і дзевачкі – у-у-у!
- Ідуць парабачкі, страляючы,
  А дзевачкі – спяваючы – у-у-у!
- Ой, выйдзем мы на горку,
  Ды вясну заклічам:
- Адамкнуць зямліцу,
  Выпусціць расіцу.
- Ой, выйдзем мы на горку,
  Ды вясну заклічам,
- Папросім мы сонца ў наша ваконца
  Вылеці, сізая галачка,
  Вынесі залатыя ключы;
  Замкні халодную зіманьку,
  Адамкні цёплае лецейка.
- Ты пчолачка ярая,
  Вылеці за мора,
  Вынесі залатыя ключы,
  Адамкні цёплае лецейка,
  Замкні халодную зімачку.
- Ты прыйдзі, Вясна,
  Ты прыйдзі, Красна,
  А гу-гу, Вясна! А гу-гу Красна!

*(Карагод "Вол бушуе")*

- Ну, вось, Вясну загукалі, а цяпер давайце ў гульні гуляць. Прапаноўваю гульню "Ластаўка і мошкі". Але спачатку нам трэба Ластаўку выбраць. (*лічыць: "Прэла, гарэла, на мора ляцела; Касцюк, Масцюк, Радзівон – выйдзі вон!"*).

*(Ідзе гульня)*

- Фу ты, во загуляўся, што піць захацелася. Хлопцы, хто са мной, айда да крыніцы.
- А мы, дзяўчаткі, давайце пакуль хлопцаў няма, наш любімы карагод завядзём.

*(Ідзе карагод)*

*(Пасля яго сканчэння з'яўляюцца хлопцы)*

- І сапраўды кажуць: няма смачней вадзіцы, чым з роднай крыніцы.
- Хлопцы, а дзе вы Яся падзелі? Ці ён у ваду праваліўся?
- Не, ён да хаты пабег. Бо ён як тая каня: піць хоча, а з крыніцы напіцца не можа.
- А пры чым тут каня?
- Ды легенда ёсць такая.
- Раскажы, Юрась, раскажы.
- Ну, калі не ведаеце, тады слухайце. Як стварыу Бог наш свет, дык уся вада была ў адным месцы. Вось сказаў Гасподзь усіх птушак і сказаў ім: "Птушачкі мае, работнічкі мае! Сабярыцеся вы ўсе і разнясіце вы ваду гэту дый па ўсяму свету, разліце вы яе ў рэчкі бягучыя, у азёры стаючыя, у крыніцы халодныя. І сабраліся ўсе птушкі і сталі насіць ваду. Насілі-насілі, пакуль усю разнеслі. Адна толькі каня не паслухалася Госпада Бога, не насіла ваду, за што і пракляў Гасподзь каню, і сказаў ёй так: "ты вады не насіла, не зможаш і напіцца – ні ў рэчцы бягучай, ні ў возеры стаючым, ні ў крыніцы халоднай – хіба што чакай майго дажджу заліўнога. І з тых пор каня просіць: "Піць хачу, піць!" – і чакае дажджу. Напіцца ні ў якой вадзе не можа, а толькі як дождж ідзе, дык яна разявіць рот і ловіць кроплі.
- А давайце пагуляем у гульню "Спрытная птушка".

*(Ідзе гульня)*

- А ці ведаеце вы, што нашы продкі-славяне верылі, што ў раслін і дрэў, як і ў людзей, ёсць душа. У целе дрэва магла жыць душа жывёлы ці чалавека – продка роду.
- Так, і мне бацька казаў, што дрэва плача ад болю, калі яго рубяць; і што ёсць звычай перш, чым сарваць кветку ці расліну, трэба было папрасіць у яго прабачэння. А перад дрэвам трэба было пакланіцца, сказаць, дзеля чаго яно спатрэбілася.
- А я яшчэ чула, што каля дрэва пакідалі гасцінец, каб душа дрэва выйшла на той час, калі яго будуць рубіць, каб яна не ведала вялікіх мук.
- І сапраўды, Алёнка, цяжка бачыць, як падаюць зрубленыя дрэвы, але ж і пра чалавека, які заўчасна захварэў кажуць: "Зваліўся, як зрублены".
- А пра дзяўчат кажуць: "Расцвіла, як кветка".
- Жыццё чалавека і дрэў або раслін заўсёды параўноўвалася ў песнях. Дзяўчаткі, а давайце заспяваем.
- Сябры, а давайце яшчэ ў адну гульню згуляем і пойдзем да хаты, а то бацькі ўжо сварыцца будуць, што на цэлы дзень з хаты пайшлі.
- Тады давайце згуляем яшчэ…
- Ну што, Ясь, хоць шкада, а ўсё ж бывай.Толькі нас не забывай.

**Ясь:** І вы, сябры даражэнькія, дружна жывіце, хутка расціце і край свой любіце.

- Беражыце кожную птушку, кожнае дрэўца, кожную кветачку.
- Шануйце, любіце Маці-Прыроду.
- Будзьце бадзёрымі, разумнымі і здаровымі.

## СЦЭНАРЫЙ СВЯТА "КАЛЯДЫ"

1. Слаўны вечар,
Каляда, каляда!
Добры вечар,
Каляда, каляда!

2.Каляда – старажытнае народнае свята. Калядаваць, гэта значыць спяваць за вокнамі песні, у якіх зычылі дабрабыту і шчасця, гуляць у гульні, вадзіць казу, каб на полі радзіла, а ў сям’і ўсе былі здаровымі і багатымі.

1. Таму, хто калядуе, заўсёды кіне ў мяшок гаспадар грош, або хто чым багаты.

2. Здаўна кажуць – як пачнеш Новы год, такім ён табе і ўдасца.

1. Дык давайце ж стрэнем гэты Новы год прыгожа ды спеўна, як дзядулі – бабулі страчалі.

2. Давайце будзем добрымі, вясёлымі і дружнымі.

– Пайшла каляда ў адну хату,
А у гэтай хаце куццю таўкуць.
– Пайшла каляда ў другую хату,
А ў гэтай хаце серабро звініць.
– Пайшла каляда ў трэцюю хату,
А ў гэтай хаце сала сквірчыць.
– Пайшла каляда ў чацвёртую хату,
І ў гэтай хаце сала шыпіць.
– Пайшла каляда ў пятую хату,
А ў пятай хаце золата блішчыць.
– Пайшла каляда ў шостую хату,
А ў шостай хаце каўбасы пякуць.
– А ў сёмую хату ў гэту ночку
Мы з вамі завітаем.
Глядзіце, запрашаем!

*(Занавес расчыняецца. Сялянская хата. Уваходзіць гаспадар – Цярэшка, кладзе дровы каля печы)*

Цярэшка: Шчодра! Шчодра! Дзе ты падзелася? (*заглядае у гаршочак які стаіць на стале*) Вось ўжо і блінкі падышлі. Шчодра!

Шчодра: Іду-у! Бягу-у! Як тут мае блінкі? Мабыць, ужо падышлі.

Цяэшка: Трэба на стол збіраць! А то ж свята сёння Каляды! Можа і да нас калядоўшчыкі завітаюць, здароў’я і багацця нам пажадаць.

Шчодра: Слухай, Цярэшка, пакуль не прыйшлі калядоўшчыкі нам трэба зрабіць калядны рытуал на добры ўраджай.

– Цярэшка а ці бачыш ты мяне?
– Не, не бачу!
– Каб жа ты не бачыў за стагамі, за копамі, за вазамі, за снапамі свету!
– Шчодра, а ці бачыш ты мяне?
– Не, не бачу!
– Каб жа ты не бачыла за гуркамі, за гарбузамі, за капустаю, за буракамі свету!

Шчодра: Каб твае словы ды праўдаю сталі.

Цярэшка: Каб было шчодра на стале і ў агародзе, мая бабка пад абрус раней клала жытнюю салому. *(Шчодра таксама гэта робіць. Нечакана чуецца стук у вакно.)*

Цярэшка: Шчодра, гэта ж, мусіць, калядоўшчыкі просяцца?

*(уваходзяць калядоўшчыкі з казой і мядзвядзем)*

– Добры вечар таму, хто ў гэтым даму.
  Нам не хочацца чакаць – загадай калядаваць!

Шчодра: Калядуйце даражэнькія, калядуйце!

Цярэшка: Калі ласка!

*(Песня: “Добры вечар, шчодры вечар”)*

– Добры вечар, гаспадару! Вынесь жа нам каўбас пару.
– Добры вечар, гаспадынька! Пахадзі ты каля печкі, вынясі нам перапечкі!

– Вынесь сала, не скупіся, каб ячмень твой урадзіўся.
– Каб нажалі сто коп жыта.
– Каб сям'я была ўся сыта.
– Каб скацінка вадзілася.
– Каб пшаніца радзілася.
– Скарэй дарыце, нас не марыце.
– Кароткія світкі – студзёна стаяць.

Цярэшка: Наш дар невялікі: рэшата аўса, наверх – каўбаса.

Шчодра: Частуйцеся, госцейкі дарагія, частуйцеся. Дзякуй, што ўважылі, нашу хату не абмінулі. *(частуе)*

– А мы ж, гаспадарочкі, не адны прышлі, а казу з сабой прывялі.

Цярэшка: Адкуль вы ідзяце?

Павадыр: Ідзём мы ад пана Года, што носіць бароду, шыроку як лапата, сіву і калмату. Мы к лету ідзём, казу вядзём і радасць нясём.

Шчодра: Дык можа козачка паскача для нас.

Павадыр: А ну, каза, павярніся, гасцям добрым пакланіся!

*(Песня: "Го-го-го, каза" )*

Павадыр: Што ж гэта стала? Мая каза ўпала, ссохла, прапала!

– Бачна, даўно ела, што так аслабела.

– Дайце казе сала, каб каза ўстала.

Механоша: Нашаму козліку не многа трэба:
Два боханы хлеба,
Сем печ перапеч,
Рэшата аўса,
Наверх каўбаса.

– А яшчэ аладкі, каб бакі былі гладкі.
– Яшчэ таго мала, дайце кусок сала.
– Чацвёрты пірог, каб казу сцярог.
– А хто такі харошы, хай насыпле грошы.

*(Калядоўшчыкі збіраюць каляду выходзячы у зал)*

Калядоўшчыкі: Каляду збіраю, песні спяваю.
Дзяўчаткі, давайце што небудзь для настрою заспяваем,
Каб душа у пляс пусцілася.
– Каляду дайце, здаровы бывайце!

*(Гучаць песні)*

Шчодра: Шаноўныя калядоўшчыкі, а ці не падкажаце, які будзе гэты год: ці багаты, ці бедны?

– Пра год няхай Варажбітка раскажа, яна шмат чаго ведае.

Варажбітка: Зараз на небе поўна зорак, значыць багата будзе ўлетку ягад і грыбоў. А вось іней на дрэвах кажа аб тым, што рана і шчодра зацвітуць вясной сады. Вірлівая мяцеліца, што была звечара, абяцала добрае раенне пчол.

Цярэшка: Што мы ўсё гаворым, ды гаворым! Давайце лепей патаньчым ды ў гульні пагуляем.

*(Танцы, гульні)*

– Ну і забавіліся ж мы з вамі, а нам жа трэба далей ісці калядаваць, песні спяваць, добрых людзей з калядамі віншаваць!
– Будзь ваша здароў, як рыжык бароў!
– Майце торбу грошаў, жывіце ў раскошы!
– Майце ўсяго даволі, а бяды – ніколі!

## ІНТЭЛЕКТУАЛЬНА-ГУЛЬНЯВАЯ ПРАГРАМА "МІФЫ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ"

Народная творчасць – няпісаная і ні кім да канца непрачытаная мудрая вусная кніга. Пяшчотныя, светлыя яе старонкі з мілагучнымі калыханкамі, адкрываюць для нас у дзяцінстве нашы маці і бабулі. Нас захапляюць цікавыя дзівосныя казкі. Мудрасцю ўражваюць прыказкі і загадкі. Гісторыю нашага народа, нашай роднай Беларусі захапляльна перадаюць паданні і легенды. Мінаюць і аддаляюцца дзесяцігоддзі, чалавецтва выходзіць на новыя рубяжы, а радкі гэтай кнігі, выказаныя стагоддзі назад, не старэюць. І будуць узбагачаць нашы сэрцы і розум, будуць вучыць нас дабру і справядлівасці, самаадданай любві да роднага краю і свайго народа – пакуль будзе доўжыцца жыццё на зямлі.

*(Гучыць музыка)*

Сёння мы з вамі адпраўляемся ў падарожжа да скарбонкі народнай творчасці, праваднікамі будуць каманды (*назвы каманд*), але спачатку нам патрэбна выбраць капітанаў каманд.

Я прапаную выбраць капітанаў каманд пры дапамозе лічылкі.

За марамі, за гарамі,
За жалезнымі слупамі –
На прыгорку церамок,
На дзвярах вісіць замок,
Ты за ключыкам ідзі
І замочак адамкні.
Прадстаўцеся нам___________________________

Віншуем капітанаў каманд. А зараз я даю вам адну хвілінку на тое, каб выбраць назву сваёй камандзе.

Якую назву прыдумала першая каманда___________________

Другая каманда____________________________

Так, пачынаем конкурс размінкай для каманд:

**1. Пераклад на рускую мову:**

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Блакітны (голубой) | Стракаты (пестрый) |
| 2 | Каралі (бусы) | Капялюш (шляпа) |
| 3 | Аксаміт (бархат) | Фіранкі (занавески) |
| 4 | Слімак (улитка) | Хмары (тучи) |
| 5 | Абрус (скатерть) | Сцізорык (нож перочинный) |
| 6 | Гурток (кружок) | Пацук (мышь) |

**2. Пераклад з рускай мовы на беларускую:**

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Влага (вільгаць) | Крыльцо (ганак) |
| 2 | Металический гвоздь (цвік) | Дешёвый (танны) |
| 3 | Сирень (бэз) | Следить (сачыць, пільнаваць) |
| 4 | Кирпич (цэгла) | Клёст (крыжадзюб) |
| 5 | Качаць (калыхаць) | Магазин (крама) |
| 6 | Мел (крэйда) | Пуговица (гузік) |

**Заданне першае:**

Першае заданне датычыцца аднаго з галоўных жанраў фальклору – цудоўнага тварэння народнага паэтычнага генія. У гэтых творах шмат чараўніцтва, вымыслу. Героі трапляюць у вельмі цяжкія сітуацыі. Але ў рэшце дабро перамагае зло.

Праўда перамагае несправядлівасць, сяброўства перамагае здраду, працавітасць перамагае гультайства.

Вы, напэўна, здагадаліся, што гэта казкі.

Зараз я зачытаю вам урыўкі з беларускіх народных казак, а вы павінны адгадаць, што гэта за казкі.

1. “Выходзіць з лесу галодны воўк. Бачыць – касец пад кустом сядзіць і нешта есць. Падышоў да яго воўк:

– Ты што ясі, чалавеча?
– Хлеб, – адказвае касец.
– А смачны ён?
– Дзіва што смачны!
– Дай мне пакаштаваць.
– Калі ласка!

*(“Лёгкі хлеб”)*

2. “Была гэта на дзіва прыгожая сярэбраная скрыначка мастацкай ювелірнай работы. На яе сценах красаваліся два залатыя зграбныя зайчыкі, частуючы адзін аднаго тытунём.”

*(“Сярэбраная табакерка” З. Бядуля)*

Старажытныя сказы крывічаў данеслі да нас скарбы беларускай міфалогіі, шмат розных паданняў. Паслухайце, калі ласка, адно з іх, і адгадайце да якога беларускага народнага свята гэта паданне мела дачыненне.

*(Паданне пра “Купалле”)*

Вы паслухалі народнае паданне. Камандам адводзіцца адна хвілінка на роздум, каб адказаць на пытанні:

1. Што гэта за свята і калі яно адбываецца?
2. Якое яшчэ народнае паданне звязана з гэтым святам?
3. Хто з беларускіх пісьменнікаў узяў сабе псеўданім ад назвы гэтага свята і чаму?

*( Купалле, 7 ліпеня нарадзіўся Іван Дамінікавіч Луцэвіч – Янка Купала)*

У народзе кажуць “З добрай песняй і жыць весялей!” Песня суправаджае чалавека ўсё жыццё: у працы, вяселлі, радасці, горы.

Назавіце пяць народных беларускіх песень, адну з якіх вы потым павінны праспяваць.

На роздум адна хвіліна…_______________________________________

*(каманды па чарзе спяваюць свае песні)*

Цудоўным моўным скарбам з’яўляюцца прыказкі і прымаўкі.

Гэта кароткія, але мудрыя выразы, іх сэнс павучальны, яны нярэдка гучаць у рыфму. Будзьце ўважлівы. Я чытаю беларускую прыказку, або прымаўку, а вы знаходзіце адпаведную рускую.

Паспрабуем:

1. Няма грошай – не бяда, калі сяброў грамада.

(Не имей сто рублей, а имей сто друзей)

2. Разам дзвюх сарок за хвост не ўтрымаеш.

(За двумя зайцами погонишься, ні одного не поймаешь)

3. Любіш гасцяваць, любі і гасціну вітаць.

(Любиш кататься, люби и саночки возить)

4. Як клічуць, так і адклікаюцца.

(Как аукнется, так и откликнется)

5. Дзе пасееш густа, там не будзе пуста.

(Что посеешь, то и пожнёшь)

6. Не будзь ласы на чужыя каўбасы

(На чужой каравай свой роток не разевай)

Наступнае заданне – інсцэніроўка прыказкі. Гледачы павінны адгадаць, што вы паказваеце (каманды атрымліваюць сваю прыказку), напрыклад:

– Баба з возу, каню лягчэй.

– Любіш паганяць, любі і каня гадаваць.

**Заданне чацвёртае:**

Загадкі развіваюць кемлівасць. Яны пашыраюць кругазор, вучаць назіраць, параўноўваць. Загадкі часта выкарыстоўваюцца ў гульнях, калі ідзе спаборніцтва на кемлівасць. У казках яны не раз былі сродкам праверкі розуму герояў.

Адгадайце, калі ласка, тры загадкі:

1. Стаіць дуб, на дубе 12 гнёздаў, у кожным гняздзе па 4 сініцы, у кожнай сініцы па 14 яек – 7 чорных і 7 белых. *(Год, месяцы, тыдні, ночы і дні)*
2. Па вадзе ідзе – не плёсне,
   Па лесе ідзе – не хропне,
   Па саломе ідзе – не шасне. *(Сонца)*
3. Царэўна бедна, але птушкі пяюць. *(Вясна)*

– Успомніце, калі ласка, тры загадкі на зімовую тэму.

**Пятае заданне:**

Усе вы чулі і ведаеце шмат гісторый пра міфічных істот, напрыклад, пра Бабу-Ягу, Русалак, Лешага. Я прапаную інфармацыю, а вы павінны адгадаць, пра каго ідзе гаворка.

*1.* “Пра іх расказваюць, што яны любяць жыць ля млыноў, пад шлюзамі і ў завадзях рэк, што бяруць да сябе, гэта значыць, топяць людзей, якія ім спадабаліся. *(Вадзяны)*

*2.* Як завуць чалавека, які пераtвораны кім-небудзь ці якіператварыўся сам сабою, па сваім жаданні ў ваўка. *(Ваўкалак)*

*3.* Стары сівы дзед з сінім або чырвоным носам. Яго клічуць да сябе на каляды. *(Мароз)*

*4.* Барадаты чалавек, жыве пад зямлёю, а хто, бядуючы, уздыхае і называе яго імя, то ён вылазіць з-пад зямлі і пытае: “Чаго патрабуеш?” А як хто ўжо гэта ведае, да не спалохаецца, да і скажа яму, чаго хоча, то ён яму тое дасць”. *(“Ох”)*

**Загадкі для балельшчыкаў:**

*1)* Дзесяць ног, шэсць вок, тры галавы ў адзін бок. *(Араты з парай коней)*
2) Я сяку лес – лес вяне, а на тым месцы гара ўстане. *(Сенакос)*
3) Тысяча братоў адным поясам падпераваны. *(Сноп)*
*4)* Усе паны паскідалі жупаны, толькі трое ў жупанах стаяць. *(Сасна, ёлка, ядловец зімою)*
5) На вадзе родзіцца, а вады баіцца. *(Лёд)*
*6)* Зімой грэе, вясной тлее, улетку памірае, увосень аджывае. *(Снег)*
7) Ідзе ў лес – дамоў глядзіць,
   Ідзе дамоў – у лес глядзіць. *(Сякера за поясам у дравасека)*
*8)* Поўна хата вераб’ёў – ніколі не выганіш. *(Сукі ў дрэве)*
9) Стаіць клён, на клёне – лён,
   На лёне гліна, а ў гліне ўсё гіне. *(Стол, засланы абрусам, а на ім міса)*
*10)* Поўна бочка круп, а на вярху вянец. *(Макаўка з макам)*
*11)* Авечка кругом чалавечка. *(Кажух)*
12) Сам мурзаты, а чысціню любіць. *(Венік)*

**Скарагаворкі для балельшчыкаў**

✓ Каваль каваў каня,
Конь кавалю капытом,
Каваль каню кнутом.

✓ Лянок не любіць лянот,
Лянот не любіць лянок.

Падвядзенне вынікаў інтэлектуальна-гульнявой праграмы.

## ***<u>Паданне пра Купалінку</u>***

✓ На свята Івана Купала славяне праводзілі (і праводзяць да гэтага часу) мноства абрадаў. Самы вядомы і адначасова таямнічы – **пошук папараць-кветкі**, які адкрывае ў чалавеку звышздольнасці: разумець размову звяроў і птушак, бачыць русалак і назіраць, як у лесе гуляюць дрэвы. Але да ўсяго іншага, існуе павер'е, што ўладальнік кветкі здольны выявіць любы скарб.

✓ Маладыя дзяўчыны збіраліся на беразе возера ці ракі і варажылі на будучыню. Для гэтага плялі вянкі і пускалі па вадзе. Калі вянок заплывае далёка, гэта абяцае шмат шчасця ў каханні. А калі вянок тануў, то блізкіх адносін з загаданым чалавек пабудаваць не атрымаецца. Плялі і па два вянкі – для жаніха і нявесты, – якія затым таксама пускалі на ваду. Калі плынь злучае два вянка, то неўзабаве адбудзецца шчаслівае вяселле.

## ***Купалінка***

Купальская ноч чорным крылом ахінула наваколле. Прытомленыя збіраннем гаючых зёлак, танцамі, скокамі праз вогнішча, збіліся ў гурт хлопцы і дзяўчаты. Развязалі вузельчыкі, дасталі з іх ежу, дамашняе віно. Пачуліся смех, жарты, добразычлівыя кпіны.

Толькі чарнабрываму Івану нявесела. Сядзіць адзінока ўбаку ад сябрукоў, думу думае. А дума тая горкая: вечар цёплы, а сэрца халодзіць. Няма ў Івана сяброўкі. Дзяўчат навокал многа, толькі ні адна з іх не прыглянулася хлопцу. Тры вянкі кінулі яму вясковыя прыгажуні з надзеяй, што разарве Іван адзін з іх і тым самым заявіць аб сваім праве на дзяўчыну. Але ўсе тры вянкі засталіся некранутымі. Пакрыўдзіліся прыгажуні, хаця выгляду і не падалі. Надзелі вяночкі на свае галоўкі, звонкім смехам заліваюцца. Глядзі, маўляў, хлопец, каб пашкадаваць не давялося. Самая прыгожая з іх – Ганна, якая вельмі пакахала Івана, не сцярпела і кажа:

– Калі сярод нас не знайшлося табе абранніцы, пайдзі і пашукай кветку папараці ў лесе. Мо, там сваё шчасце знойдзеш.

Сядзіць хлопец, маўчыць, пра сваё думае. Раптам побач нячутна з’явілася нечая лёгкая постаць, пяшчотныя рукі дакрануліся да галавы юнака. Заплюшчыў той вочы, думаючы, што гэта сон, а калі праз імгненне адкрыў іх, убачыў, што побач нікога няма. Толькі на траве ля самых ног вяночак ляжыць. Хацеў было хлопец адкінуць той вяночак, падумаўшы, што гэта дзяўчаты вырашылі пажартаваць над ім, але – во дзіва! – вяночак быццам да рук прыліп.

“Відаць, справа рук нячысціка, – думае Іван пра сябе. – Нездарма ж старыя гавораць, што ў поўнач на Купалле розныя ваўкалакі, чэрці, ведзьмы са сваіх сховішчаў вылазяць, каб людзям шкоду прынесці». Праўда, гэтая нечысць агню баіцца, таму на Купалле ў вёсках ля кожнай хаты вогнішча гарыць.

– Не бойся, Іван, ідзі за мной, я дапамагу табе знайсці кветку папараці, – чуецца побач пяшчотны голас. Станеш самым шчаслівым на свеце.

“Будзь што будзе”, – вырашыў хлопец і ціхенька, каб не прыцягнуць увагі сяброў, падаўся ў лес. Спачатку ісці было лёгка: дарогу асвятлялі водбліскі купальскага кастра на паляне, вакол якога весялілася моладзь. Але чым далей ішоў хлопец, тым вузейшай рабілася сцяжынка, больш цёмным і глухім станавіўся лес. Ногі блыталіся ў густой траве, вецце балюча сцёбала па твары. Спачатку здалёк, а потым усё бліжэй і бліжэй чуліся нейкія невядомыя гукі, падобныя на выццё ваўка або рогат савы.

“Трэба вяртацца хутчэй назад, пакуль не заблудзіўся, – мільганула думка ў галаве Івана. – Інакш не толькі кветку папараці не знайду, а жывым з гэтай глухамані не вярнуся”.

Успомніўшы пра вянок, хлопец кінуў яго на зямлю. І здарылася цуда – вянок ураз ператварыўся ў вогненнае кола. Пакацілася яно па зямлі, завісла на галінах дрэў. А наўкола стала відна, як удзень.

Паспрабаваў было хлопец зняць з дрэва свой вянок, але толькі руку да яго працягнуў, а вянок-сонейка вышэй падняўся, завіс на веццi дуба. Слепіць вочы, быццам дражніць Івана.

Пабяжыць той наперад, а сонейка на зямлю скоціцца, у густой траве схаваецца. Застыне хлопец на месцы, не ведаючы, куды ісці далей, і тут жа чуе ласкавы голас: "Ідзі сюды, Іванка. Не бойся».

– Хто ты такая? Адгукніся! – крычыць юнак.

– Я – Купалінка.

– Тады навошта ўцякаеш ад мяне?

– Лёгкага шчасця не бывае. За яго змагацца трэба, – чуецца ласкавы голас.

– Што я павінен зрабіць? Навучы! – просіць Іван.

– Ты знойдзеш кветку папараці, – адказвае Купалінка. – Як сарвеш яе, хуценька вяртайся дадому. Што б ні рабілася ў цябе за спіной, чые галасы ні пачуеш – не азірайся. Інакш будзе бяда.

Сказала так Купалінка і як скрозь зямлю праваліласся. Зноў стала наўкола цёмна-цёмна. Як быць? Куды ісці?

Прачытаў пра сябе малітву Іван і паціху пайшоў наперад.

Колькі ён ішоў так, і сам не ведае. Раптам бачыць – наперадзе, у некалькіх кроках ад яго, нейкія агеньчыкі на зямлі блішчаць. Падышоў ён бліжэй і вачам сваім не верыць: перад ім незвычайная па прыгажосці кветка папараці. На што ўжо прыгожая вясёлка пасля дажджу на небе, але і яна нішто ў параўнанні з цудоўнай кветкай. Падобная на пяро Жар-птушкі, зіхаціць, пераліваецца.

Толькі памкнуўся Іван сарваць кветку, як з усіх бакоў нешта затрашчала, загукала, завыла, заверашчала, заскуголіла. І ўсё ж хлопец дацягнуўся да кветкі, сарваў яе, сунуў за пазуху і заспяшаўся ў сваю вёску.

Ішоў, а за спіной трашчала вецце, на ўсе лады лямантавала нячыстая сіла. Пагражала рознымі карамі, упрошвала азірнуцца, паслухаць, што яна скажа. Але Іван памятаў словы Купалінкі, не паддаваўся ні на якія ўгаворы, ішоў і ішоў наперад.

Быў бы, пэўна, Іван першым чалавекам у цэлым свеце, якому пашчасціла адшукаць кветку папараці, калі б нечакана не пачуў знаёмы голас Купалінкі:

– Пачакай, Іванка, я табе нешта скажу…

Не стрымаўся хлопец, азірнуўся назад, але нікога не ўбачыў. Па радасных енках нячысцікаў зразумеў, што яго падманулі. Сунуў руку за пазуху, дзе ляжала цудоўная кветка, а на яе месцы – галінка вярбы.

Застагнаў ад роспачы хлопец, падняў вочы ўгару і ўбачыў далёка-далёка ледзь прыкметны промнік святла.

– Купалінка! Пачакай мяне! – закрычаў у роспачы Іван. – Парай, што рабіць…

Доўга чакаў адказу, але так і не дачакаўся. Тады, памаліўшыся на ўсход, пайшоў хлопец у лес, пайшоў і не вярнуўся дадому. Старыя людзі казалі, што ў ноч на Купалле недзе далёка ў лесе перагукваюцца дзявочы і юнацкі галасы. Можа, гэта Іван шукае сваю Купалінку? А можа, разам шукаюць яны згубленую кветку папараці?..

Чаго на свеце не бывае… [1].

**Літаратура:**

*1. Прыстань ваўкалакаў: чарадзейныя казкі / укладальнік А.І. Гурскі, мастак У.П. Савіч. – Мінск: Юнацтва, 2000. – 349 с.*

## СЦЭНАРЫЙ
## ФАЛЬКЛОРНАГА СВЯТА “ДАЖЫНКІ”

*(На сцэне малодшая група фальклорнага калектыву.*
*Удзельнікі трымаюць у руках каласы. Яны пад музыку мятуць жытнёвае поле.)*

**Гаспадар:** А што ў поле рана гукала?
**Дзеці:** Гаспадар, прыйдзі да нас, паглядзі на нас...
*(Гаспадар аглядае поле.)*

**Гаспадар:** *(да гаспадыні)* Гаспадыня, ты была ў полі? Бачыла, што жыта ўжо паспела?

**Гаспадыня:** Бачыла, гаспадарочку, бачыла! Трэба яго ўжо жаць.

**Гаспадар:** Ну, дык тады ідзі кліч жней. А я пайду да каваля, закажу сярпоў.

**Гаспадыня:** *(кліча жней)* Жнеечкі, сябровачкі, хадзіце да мяне жыта жаць.

**Жнеі:** (выходзяць) Ваша ніўка залатая, нашы сярпы вострыя.
(*Жнеі спяваюць, водзяць карагод “Пойдзем, дзеткі, каля жыта”. Ідзе гульня. Жнеі ловяць дзяцей, якія імітавалі поле і ставяць іх у “снапы”, у адно месца, робяць “вялікі сноп”. Прызначаюць старэйшую жняю (“Пастацянку”), сплятаюць вянок і надзяваюць ёй на галаву.*)

**Ст. жняя:** Мы свайму гаспадару
Ды зрабілі славу.
Жытачка пажалі,
У копачкі паклалі,
Адна барада засталася.
*(Водзяць карагод вакол барады, спяваюць.)*

Стаяў казёл на гарэ),
Дзівиваўся барадзе.
Діва, дзіва.
*(З’яўляецца гаспадар.)*
**1 жняя:** Ой, гаспадарочку наш,
Дажыначкаў час.
**Спяваюць:** А ў нашага пана
Дажыначкі рана.
**2 жняя:** Канец ніўцы, канец,
Упляцём гаспадару вянец.
*(Старэйшая жняя надзявае вянок гаспадару, вакол яго водзяць карагод і спяваюць.)*
– Каціўся вянок з поля...

**Гаспадар:** Дзякуем вам, жнеечкі, за добрую працу!
Ад шчодрае нівы.
Ад роднай зямліцы
Хачу вам у пояс усім пакланіцца.

**Гаспадыня:** Дзякую вам, сяброваччкі, вось як разам, дык хутка поле заваявалі.
**1:** Так-так, Галечка, нездарма ж кажуць – “Адзін у полі не воін”.
**2:** Адна галавешка і у печы не гарыць.
**3:** Адной рукой і вузла не завяжаш.
**4:** Адзін і ў кашы не споры.

**Гаспадар:** Ну, хопіць ужо, жнеечкі. Я ведаю, што вы і ў працы спрытныя і на язык вострыя, ведаеце шмат прыказак, прымавак і вельмі добра спяваеце.

**Жнеі:** Гаспадынька, нут-ка,
Завівайся нам хутка,
Так як мы завіваліся,
Каля ніўкі нападжыналіся.

*(Гаспадыня і гаспадар частуюць жнеек. Гучыць песня “Частуйцеся, госці”.)*

**Гаспадар:** Вось якіх слаўных жнеек запрасіў я. І працуюць слаўна, і спяваюць хараша. У мяне аж самі ногі ў скокі просяцца. Музыкі, грайце нам!

*(Усе танцуюць “Польку”, “Падыспань”, “Кракавяк” і інш. танцы.)*

**Гаспадар:** А чаму ж мне не пець,
Калі ў маёй хатачцы парадак ідзець?

*(Гучыць песня “Чаму ж мне не пець?”)*

**Госць:** Як жа парадак ідзець?
Жыта нажалі, у снапы павязалі -
А сена ці пакасілі? А поле ці ўзаралі?

**Усе:** Усё зрабілі.

*(Гучыць песня “Малачу ж я”. З’яўляюцца хлопцы-пахары. Ідзе гульня “Пахары і жнеі”.)*

**Пахары:** А мы пашаньку пахалі,
Барозны глыбокія махалі,
Барозны шырокія,
Палосы шырокія,
А вы, жнеі, худыя,
У вас сярпы тупыя.

**Жнеі:** А вы, пахары, худыя,
У вас плугі тупыя,
А вы пашню не пахалі,
На мяжы ляжалі.
А мы жнеі маладыя,
Сярпы нашы залатыя,
Жыта мы пажалі,
Ды ў снапочкі павязалі,
У полі стагамі,
На гумне варахамі.

**Гаспадар:** Дзяўчаты, песня ад сэрца
Шчаслівага рвецца,
Бо песня самім жа
Жыццём саздаецца.

*(Гучыць песня “А ў гародзе ярыца”.)*

**Гаспадар:** Намалацілі хлеба,
А зараз гуляй колькі трэба.
Частушкі-весялушкі!
*(Гучаць прыпеўкі.)*

**Адна са жней:** Пойдзем, дзевачкі, дамоў,
Пойдзем, прахадзімачкі.
Дадзім гаспадару спакой,
Закончым мы дажыначкі.
*(Уходзяць з песняй: У нас сёння вайна была,*
*Усё поле зваявалі...)*

## СЦЭНАРЫЙ НАРОДНАГА СВЯТА-БЯСЕДЫ
## “НА ПРЫЗБЕ”

***Г-р:*** Усіх, усіх, хто не ленаваўся.
Добра справаю займаўся
***Г-ня:*** І не траціў марна час,
Запрашаем на прызбу да нас.
*(Гульня “Казёл”.)*
***Г-р:*** Скача, скача верабей,
Ён склікае ўсіх гасцей,
Да гасцей ён просьбу маець,
Ён цілікаець, як знаець:
– Скіньце, госцейкі, па зярну,
Я вам казачку раскажу:
Жылі-былі дзед да баба,
Высеклі яны ляда,
Пасеялі аўса –
Вось і казка ўся.
***Г-ня:*** А вы, госці мае,
Вы прашоненькія,
А чаму вы такія невясёленькія?
Гэй, музыкі, браточкі мае,
Заграйце “Полечку” мне.
Мае ногі туп, туп тупацяць
І на месцы зусім не стаяць.
Добры вечар, суседкі дарагія!
Добры вечар......................., а што гэта
ты так запыхалася?

– Мае вы суседзейкі,
Навіну скажу вам:
Сівая свіння
На дубе гняздо звіла,
На дубе гняздо звіла.
Казлянятак прывяла.
А мой мужык хітры быў.

Сена шылам накасіў.
Над прыпечкам стог злажыў,
Кошку сенам накарміў.

– Гэта што? А вось у нашага суседа
Учора была бяседа:
Свіння ў дудку іграда,
А курыца скакала,
А пятух прыпяваў
І ножкай прыбіваў.
***Г-ня:*** Госцейкі, вы гаспадара майго не бачылі?
Відаць, мяне не знайшоў,
У другі бок пайшоў.
***Г-р:*** Госцейкі, гаспадарыньку маю не бачылі?
Відаць мяне не знайшла,
У другі бок пайшла,
Куды ж гэта мне бегчы,
Як гаспадыню дагнаць?
***Г-ня:*** Госцейкі, гаспадара майго не бачылі?
***Г-р:*** Гаспадарыню маю не бачылі?
Суседачкі, дзе ж мая гаспадыня?
*(Раптам гаспадар і гаспадыня сустракаюцца.)*
***Г-р:*** Ой, гаспадыня, куды ж ты падзелася?
Я ж табе хацеў расказаць, што толькі што ў агародзе бачыў.
***Г-ня:*** І што ж ты там бачыў?
***Г-р:*** Шпарка па двары хадзіў,
Дзёўбаў зерне кракадзіл.
Што за дзіва, што за цуд,
У рэчцы плавае вярблюд.
Рыкае ды лае, хвосцікам віляе.
Есць кабыла сала, а мужык авёс,
Кабыла села ў сані,
А мужык павёз.
Кошка мышку сустракала,
"З'ем цябе", – яна сказала,
Сядзіць кошка ў нары,
Мыш гуляе па двары.
***Г-ня:*** Ды не на двары завіхаецца,
А ў цябе над кашуляй хаваецца.
***Г-р:*** Ратуйце, дапамажыце,
Ад лютага звера абараніце!
*(Мышка ўцякае.)*
Ой, ой, ледзь не памёр ад жаху.
***Г-ня:*** Бачу нешта яшчэ, даражэнькі, ты хаваеш пад кашуляй!
***Г-р:*** Назбіраў я кветак.
***Г-ня:*** Для мяне?
***Г-р:*** Для гасцей.
***Г-ня:*** А для мяне?
***Г-р:*** Пагляд зі лепш на гэта.
Ну што, убачыла?

***Г-ня:*** Гарлачык.
***Г-р:*** Гаспадыня, давай у гарлачыкі згуляем. (Гульня)
***Г-ня:*** Ну, наскакаліся? Цяпер сядайце, адзін другога прыглядайце.
А ў мяне для вас квас,
Зроблены з хлеба.
З майго кваску не кінешся ў таску.
А які яшчэ акрамя хлебнага бывае квас?
(Кляновы, мядовы, бярозавы, бруснічны.)
***Г-ня:*** Але што гэга нашы хлопцы, дзяўчаты засумавалі? Лепш прыпеўкі б заспявалі.
*(Прыпеўкі)*
Мы прыпевачкі-смяшынкі
Праспяваем весела
І прытопнем, калі трэба –
Усміхнецца нават неба.

Стары заяц сена косіць,
А ліса зграбае.
Муха сена к возу носіць,
А камар складае.

Не судзіце, мужыкі.
Не судзіце, цёткі,
Беражыце языкі
Дочкам на падмёткі.

А нашыя дзевачкі
Толькі на прыпевачкі.
Сена грэбсці – не хачу,
Бо я ножкі прамачу.

Пагарэлі хамуты,
Хай гараць і лямцы!
Як такі з цябе танцор –
Лепш сядзець на лаўцы.

Не глядзіце на дзяўчат
Што ў дзяўчат за брошкі,
А вазьміце паглядзіце,
Ці памыты ножкі.

Мы смяяліся і пелі,
Пакуль вам не надаелі,
А цяпер наш шчыры смех
Мы пасадзім ў доўгі мех.

***Чорт:*** Каб выкупіць свой фант – трэба адну з загадак адгадаць.
Повен падпечак залатых авечак. *(Жар у печы)*

Было жоўтым, вырасла зялёным,
Сонца пацалавала
І зноў жоўтым стала. *(Збожжа)*

Маці з локаць, бацька з сажань,
А дзеці з палец. *(Граблі)*

Зімою на суку, летам на лугу,
На траву гляну і тая вяне. *(Каса)*

Расцілі, збіралі, тапталі, ткалі
І на стол заслалі. (Абрус)

Белая кабыла ўвесь лес з'ела. *(Печ)*

Стары згорблены дзядок
Мае доўгі насок,
Пхне перад сабой лясок
І складае ў снапок. (Серп)

– Бачу, сяброчкі, што вы засядзеліся, разленаваліся.
А чым ленавацца – лепш працаваць.
Давайце мы на памяць усе разам зробім што-небудзь карыснае.
***Усе:*** А што?
– А, напрыклад, дрэва пасадзім.
***Усе:*** А якое?
– А хай сабе і грушу!
*(Ідзе гульня "Груша".)*

А мы грушу пасадзілі (2)
А я маладзенька, туп-туп-туп (2)...

– Як, госцейкі, вам спадабалася? І шкала, а ўсё ж бывайце.
– Толькі нас не забывайце. Хутка расціце, добра жывіце, край свой любіце.

*(Гульня "Казёл")*
Як хадзіў наш казёл, ды па ельнічку,
Хлопцаў, дзевак запрашаў
У госці на прызбачку…

## ФАЛЬКЛОРНА-ГУЛЬНЯВАЯ ПРАГРАМА "ЯК СОНЕЙКА ВЯРТАЛІ"

Добры дзень, дзеткі даражэнькія!!!
Сённяя я да вас завітала ў госці каб расказаць казачку "Як сонейка вярталі".

– Даўно гэта было, мусіць, у тыя часы, каліна на нашай зямлі гаспадарылі паны і вадзілася шмат рознай нечысці – гэта і чэрці, і вадзянкі, і лесуны, і кікімары, і брыдкі страшны аднаглазы Цмок.

Павейце, ветры,
Рана, рана!
Па чыстым полі
Нясці весці нашаму пану,

Што яго жнейкі
Жыта пажалі,
Жыта пажалі,
У копны паклалі.

У той пагожы жнівеньскі дзень жнейкі дажыналі ўжо апошнее жыта на панскім полі. Высока ў небе, горача паліла сонейка. У лясочку, які быў побач з полем, пад бярозай моцна храпеў паніч. Адна жнейка не магла больш вытрымліваць такую спякоту і звярнулася да сонейка:

– Сонейка, любае, схавайся за аблачынку, мо тады хоць крыху палягчае працаваць.

Сонейка паслухалася працавітых жнеек і схавалася за воблачка. А паніч як храпеў, так і храпіць далей, нават не варухнуўся.

– І як у яго бакі не баляць? Ноччу спіць, днём таксама спіць. Каб жа толькі спаў! – кажа Янінка, – а то як сядзе за стол, дык за вушы не адарваць ад яды. Больш за ўсіх нас утопча і скажа, што мала.

– А мы яму спаць не дадзім! – вырашылі жнейкі…

– Лепш не чапайце, – папярэджвае Яніна, – а то скажа пану, бацьку свайму, пакаштуеце тады бізуна.

Але дзе ж там, вельмі жнейкам захацелася над панічам-лежабокам пасмяяцца… і просяць яны Сонца:

– Сонейка, пасвяці на паніча-гультая, разбудзі яго! Сённяшні дзень – год корміць, а ён ляжыць як калода.

Сонейка выплыла з-за воблака, пакацілася па небе і спынілася як раз над панічам. Паніч яшчэ крыху пахрапеў, але потым пачаў варочацца, круціцца, як уюн ад солі. Дзяўчатам жнейкам смешна, як паніч стогне:

– О-е-е! Хто адважыўся мяне разбудзіць?.. Дзівацтва нейкае, нікога побач няма… А вы чаго гультайкі пасталі тут і яшчэ смеяцеся? Жыта лепш жніце, а то бацька прыйдзе, дык я пагляджу як вы пад бізуном пасмеяцеся.

А тут як на зло і сам пан ідзе.

– От, дармаеды! Голадам замару! Гэтак трэба ж так мала нажаць! Толькі стой ля вас з бізуном! Ноччу будзеце жаць! А то не працуеце, а пад сонцам толькі прагульваецеся. Даўно трэба з неба гэтае свяціла прагнаць!

І не паспеў пан закрыць рот, як стала на вуліцы цёмна як ноччу, пачуўся страшны раскацісты рогат і з’явіўся Цмок.

– Значыць, не патрэбна людзям сонца? Праклінаеце яго. То цяпер аднаму мне яно свяціць будзе!

– Як жа мы цяпер без сонейка будзем? Хто нас цяпер абароніць? Як жа нашы дзеткі вырастуць? Жыта нашае, хлеб наш прападзе. Вярні, Цмок, наша Сонейка. І без таго людзям жыць цяжка!

А Цмок ім кажа:

– Ніхто не адолее мяне і не верне Сонца. Бо для гэтага трэба вялікая сіла, веды, знаходлівасць.

*(вядучая звяртаецца да ўдзельнікаў)*

Сябры, я думаю што сярод вас таксама ёсць дужыя і спрытныя асілкі якія змогуць працістаяць Цмоку. Давайце паглядзім! Я прапаную згуляць у незвычайную гульню. У якую? А ў тую, што гулялі яшчэ нашы бабулі і дзядулі.

*Гульня “Перацяжкі”*

– Бачу я, кажа Цмок, што дужыя ёсць, але ж адной сілай, без розуму нічога не зробіш. Вось калі здолееце выканаць усе мае загады, тады Сонейка само падымецца і пачне свяціць. Але я думаю, не відаць вам Сонейка, як сваіх вушэй, бо загады мае не простыя будуць.

Для таго, каб іх выканаць, вы павінны ведаць народныя звычаі і абрады, народныя рамёствы і промыслы. Вось у гэтым кошыку правільныя адказы.

– Якія адказы? – не разумее Яніна. – А пытанні дзе?

А Цмок і кажа:

– У вершах вы павінны знайсці прыклады народных слоў і кожнаму слову адпавядае нейкая рэч у кошыку:

1.“Стаяў у місцы скорам  
сяго-таго для верашчакі,  
Хоць невялкія прысмакі –  
Цыбуля, часначок і ліст бабкоў,  
Ды сальца некалькі брускоў”.

– Што такое “ліст бабкоў”?

*(лаўровы ліст)*

1. “Гэй, цельпучок, ты наш кірпаты!  
Кінь суслу, лепш закуры…”

– Што таке сусла?

*(пустышка)*

2. Банкятуе з казакамі, мёд, квас п’е квартай,  
К маладзіцам і дзяўчатам лезе смоллю ў жарты.

–Што такое “кварта”?

*(літровая кружка)*

Жнейкі таксама ўсе словы назвалі. Здзівіўся Цмок іх ведам і кажа:

– Бачу, што Сонейка падымацца стала, але для таго, каб яно ўзышло, трэба на шмат маіх пытанняў адказаць. Я бачу, што сярод вас ёсць музыкі і спевакі, дык пайграйце мне і паспявайце, а я паслухаю.

І пачалі жнейкі спяваць Цмоку песеньку.

– А давайце зараз і мы з вамі таксама праспяваем гэту песеньку, а нехта з вас будзе падыгрываць на музычных інструментах.

“Здзіўляеце вы мяне, – кажа Цмок, – ну, глядзіце далей, вось бачыце гэтыя рушнікі, адкажыце, дзе і ў якіх мэтах яны выкарыстоўваліся?”

*(адказы дзяцей)*

– Нарадзіліся рушнікі ў глыбокай старажытнасці са з’яўленнем льняных тканін. Спачатку яны былі сціплымі, чыста бытавога прызначэння – імі ўціраліся, і насілі ў рушніку абед у поле. Але кожная гаспадыня хацела, каб яе рушнік быў самы прыгожы. І таму з’явіліся на рушніках замыславатыя ўзоры.

Дзеткі вам, напэўна, ужо надакучыла сядзець, дык давайце пагуляем.

*(беларуская народная гульня “Барада”)*

Бачу я, што пра рушнікі вы ўсё ведаеце, а вось пра гэтыя рэчы, што вы мне адкажаце *(паказвае гліняныя рэчы: свістулькі, посуд)*

Гліняныя фігуркі ляпілі яшчэ ў першабытныя часы. Свістулькі і бразготкі ўжываліся нашымі продкамі не толькі як забаўкі, лічылася, што яны ахоўвалі ад “нячыстай сілы”.

*(Беларуская народная гульня ў “Гарлачык”)*

Рабілі таксама і саламяныя лялькі. Вазьме, бывала, жнейка пук саломы, перагне папалам, перавяжа ніткаю ў двух, трох месцах – вось і тулава чалавека. Танчэйшы пучок устаўлены ўпоперак – гэта ручкі.

*(Беларуская народная гульня "Каноплі")*

– Глядзіце, глядзіце! Сонейка амаль што выглянула.

– Не спяшайцеся вельмі, яшчэ не усе заданні я вам выклаў. Ведаю я, як вaward можаце спяваць, граць, а вось як вы карагоды водзіце не ведаю.

*(гульня-карагод "Талакуха")*

Грала, грала сонейка,
Небагата грала.
У хмарку схавалася,
Дажджу напужалася.
Камарочкі вы мае,
Не кусайце вы мяне,
А кусайце жнеек
Каб мне ўцячы неяк.

І гэта вы адолелі заданне. А сонейка яшчэ вышэй паднялося. Апошні загад такі, адгадаеце мае загадкі – быць па вашаму, будзе тады свяціць сонейка ўсім людзям. Не адкажаце – паплыве яно у маё царства і буду я цешыцца ім сам:

– Расцілі, збіралі, тапталі, ткалі і на стол заслалі. *(Абрус)*

– Было жоўтым, вырасла зялёным, сонца пацалавала і зноў жоўтым стала. *(Збожжа)*

– Зімою на суку, летам на лугу, на траву гляне і тая вяне. *(Каса)*

– Стары згорблены дзядок мае доўгі насок,
пхне перад сабой лясок і складае у снапок. *(Серп)*

Апошняе Цмокава заданне выканана. І зноў сонейка будзе служыць людзям. А Цмоку прыйдзецца зноў аднаму сядзець у сваім падземным царстве.

А сонейка яснае будзе свяціць для ўсіх добрых людзей.
Вось і ўся казачка. А я з вамі развітваюся.
Да пабачэння, да новых сустрэч.

Учебное издание

# ФОРМИРОВАНИЕ НАЦИОНАЛЬНОГО САМОСОЗНАНИЯ СТУДЕНТОВ: МЕРОПРИЯТИЯ, ВИКТОРИНЫ

Методические рекомендации


Составители:

**МИХАЙЛОВА** Елена Леонидовна

**САВИЦКАЯ** Татьяна Витальевна

**КОРОЛЬКОВА** Лариса Викторовна



Технический редактор *Г.В. Разбоева*

Компьютерный дизайн *Л.В. Рудницкая*

Подписано в печать 25.03.2025. Формат 60x84 $^{1}/_{16}$. Бумага офсетная.
Усл. печ. л. 3,02. Уч.-изд. л. 2,32. Тираж 35 экз. Заказ 31.

Издатель и полиграфическое исполнение – учреждение образования «Витебский государственный университет имени П.М. Машерова».

Свидетельство о государственной регистрации в качестве издателя, изготовителя, распространителя печатных изданий
№ 1/255 от 31.03.2014.

Отпечатано на ризографе учреждения образования «Витебский государственный университет имени П.М. Машерова».
210038, г. Витебск, Московский проспект, 33.